УДК 91:(348.147+371.3)

І.П. ГАЛАЙ, С.І. СІДАР

# СУПРАЦОЎНІКІ ГЕАГРАФІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА – ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ





**Галай Иван Петрович**, кандидат географических наук, доцент кафедры физической географии материков и океанов и методики преподавания географии БГУ. Область научных интересов – физическая география и методика преподавания географии. Соавтор учебных пособий по географии для школ и вузов.

**Сидор Сергей Иванович**, доктор педагогических наук, профессор кафедры экономической географии Беларуси и стран Содружества. Область научных интересов – социально-экономическая география Беларуси, методика преподавания географии. Автор учебника по географии Беларуси для средних школ.

Chronologically educational and methodical literature for higner and secondary schools is considered. Training and methodical manuals under consideration have been published by the teaching staff of Geography Department of National University of Belarus in the period since the foundation of the University in 1921.

Важным напрамкам навукова-педагагічнай дзейнасці супрацоўнікаў факультэта на працягу ўсяго часу яго існавання з'яўляецца падрыхтоўка і выданне навучальных і метадычных дапаможнікаў для студэнтаў, настаўнікаў і вучняў.

Пачатак стварэння беларускай навучальнай геаграфічнай літаратуры быў пакладзены А.А.Смолічам, М.В.Азбукіным, М.А.Грамыкам, якія працавалі ў БДУ да арганізацыі геаграфічнага факультэта. А.А.Смоліч спецыяльна для агульнаадукацыйнай школы падрыхтаваў скарочаны варыянт сваёй працы "Геаграфія Беларусі", якая застаецца неперасягнутым узорам глыбокага навуковага даследавання і разам з тым жывога, вобразнага апавядання аб прыродзе і гаспадарцы Беларусі, яе культуры і жыхароў. Кнігі А.А.Смоліча "Кароткі нарыс геаграфіі Беларусі" (1925 г.), М.В.Азбукіна "Геаграфія Еўропы" (1924 г.), А.А.Смоліча і М.В.Азбукіна "Геаграфія пазаеўрапейскіх краёў" (1925 г.), М.А.Грамыкі "Пачатковая геаграфія" (1923 г.) першыя беларускія падручнікі па ўсіх тагачасных школьных геаграфічных курсах.

Пасля арганізацыі ў 1934 г. геаграфічнага факультэта яго выкладчыкі і навукоўцы ўнеслі значны ўклад у стварэнне навучальнай літаратуры па геаграфіі Беларусі. Першай кнігай такога жанру можна лічыць выдадзеную ў 1952 г. "Геаграфію Беларускай ССР" В.А.Дзяменцьева і М.Т.Раманоўскага, зацверджаную Міністэрствам асветы рэспублікі ў якасці дапаможніка для настаўнікаў і студэнтаў. На іх была разлічана і кніга "Прырода Беларусі. Фізіка-геаграфічны агляд" В.А.Дзяменцьева, А.Х.Шкляра, В.П.Якушка (1959 г.). У 1965 г. выдадзены падручнік для ВНУ "Геаграфія Беларусі" пад рэдакцыяй В.А.Дзяменцьева, М.Т.Раманоўскага, С.М.Мельнічука (2-е выданне выйшла ў свет у 1977 г. пад рэдакцыяй В.А.Дзяменцьева, М.Т.Раманоўскага, І.І.Трухана, А.Х.Шкляра). З удзелам М.Т.Раманоўскага, І.І.Трухана быў створаны навучальны дапаможнік для студэнтаў эканамічных ВНУ "Эканамічная геаграфія БССР" пад рэдакцыяй М.С.Мельнічука (1967, 1973, 1982 гг.). У апошні час калектывам эканоміка-геаграфічных кафедр факультэта падрыхтаваны падручнік па сацыяльна-эканамічнай геаграфіі Беларусі пад рэдакцыяй Л.В.Казлоўскай. Ёй жа распрацавана праграма па гэтаму курсу для ВНУ.

За апошнія дзесяцігоддзі супрацоўнікамі факультэта было выдадзена многа дапаможнікаў для вышэйшай школы па агульных і спецыяльных геаграфічных дысцыплінах. Сярод іх "Гісторыя геаграфіі. Ч.1. Геаграфія ў старажытныя і сярэднія вякі" В.А.Дзяменцьева, А.Н.Андрушчанкі (1962 г.), "Агульная тапаніміка" В.А.Жучкевіча (выданні 1965, 1968, 1980 гг.), "Азёразнаўства. Геаграфія азёр Беларусі" (1967, 1981 гг.) і "Асновы геамарфалогіі" (1986 г.) В.П.Якушка, "Геало-

гія і карысныя выкапні СССР" (1965, 1970, 1975 гг.), "Геалогія і карысныя выкапні Беларусі" (1962, 1970, 1975 гг.), "Геалогія агульная і гістарычная" (1982 г.) Дз.М.Каруліна (апошняя ў сааўтарстве з Б.М.Гурскім), "Фауна Беларусі і ахова прыроды" Ф.Н.Вароніна (1967 г.), "Эканамічная картаграфія" Р.А.Жмойдзяка і В.Я.Крышчановіча (1973 г.), "Фізічная геаграфія СССР" (ч.1 – 1965 г., ч.2 – 1967 г., ч.3 – 1971 г.) С.М.Зубава, "Геаграфічныя асновы меліярацыі" (1974 г.) і "Меліярацыйная геаграфія Беларусі" (1978 г.) В.С.Аношкі, "Выкарастанне прыродных рэсурсаў і ахова прыроды" Г.І.Марцынкевіч (1977, 1985 гг.), "Геахімія ландшафта" (1981 г.) і "Матэматычныя метады ў фізічнай геаграфіі" (1987 г.) М.К.Чартко, "Фізіка-геаграфічнае раянаванне" В.А.Яромінай (1982 г.), "Асновы геаграфічнага прагназавання" В.С.Аношкі, А.М.Трафімава, В.М.Шырокава (1985 г.), "Методыка эканоміка-геаграфічных даследаванняў" Б.А.Манак (1985 г.), "Асновы геаграфіі турызму і экскурсійнага абслугоўвання" І.І.Пірожніка (1985 г.), "Асновы ландшафтазнаўства" Г.І.Марцынкевіч, Н.К.Кліцуновай, А.М.Матузкі (1986 г.), "Фізічная геаграфія мацерыкоў і акіянаў" (ч.1 – 1986, аўтары В.А.Жучкевіч, М.В.Лаўрыновіч; ч.2 – 1988 г., аўтары І.П.Галай, В.А.Жучкевіч, Г.Я.Рылюк), "Асновы экскурсазнаўства" Н.А.Гецэвіч (1988 г.). "Комплекснае выкарастанне і ахова водных рэсурсаў" В.М.Шырокава, А.Б.Авакяна (1990 г.), "Біягеаграфія з асновамі экалогіі" В.Н.Кісялёва (1995 г.).

Выдзадзены шэраг метадычных дапаможнікаў для студэнтаў па правядзенню практычных, лабараторных і семінарскіх заняткаў, вучэбных палявых і вытворчых практык. Назавем некаторыя з іх: "Лабараторныя заняткі па картаграфіі" В.Я.Крышчановіча (1960 г.); "Практычныя і семінарскія заняткі па фізічнай геаграфіі замежных краін" В.Г.Заўрыева, Н.П.Козыр (1963, 1971 гг.); "Лабараторныя заняткі па тапаграфіі з асновамі геадэзіі" Р.А.Жмойдзяка, В.Я.Крышчановіча, Б.А.Мядведзева (1969, 1979 гг.); "Гідралагічная практыка" Г.М.Базыленкі, П.С.Лопуха (1979 г.); "Палявая і лабараторная практыка па глебазнаўству" пад рэдакцыяй А.Г.Мядведзева (1974, 1981 гг.); "Палявая практыка па тапаграфіі з асновамі геадэзіі" Р.А.Жмойдзяка, Б.А.Мядзведзева (1987 г.); "Навучальны дапаможнік па палявой геаграфічнай практыцы" (ч.1 – 1990 г., ч.2 – 1991 г.) пад рэдакцыяй В.С.Аношкі, Р.А.Жмойдзяка, П.С.Лопуха.

Выкладчыкамі факультэта створана і выдадзена ў асноўным на ратапрынце шмат праграм па навучальных прадметах, перш за ўсё па дысцыплінах спецыялізацыі, а таксама метадычных парад, рэкамендацый, указанняў, заданняў і г.д. У апошнія гады распрацаваны навучальныя планы па спецыяльнасцях "Геаграфія", "Геалогія" (зацверджаны Міністэрствам адукацыі і навукі) і "Рацыянальнае прыродакарыстанне і ахова прыроды".

У 1990 г. выйшаў з друку "Атлас Беларускай ССР" – навучальна-даведачны картаграфічны дапаможнік (старшыня рэдкалегіі Р.А.Жмойдзяк). Аўтарамі пераважнай большасці карт з'яўляюцца выкладчыкі і навукоўцы факультэта. Атлас шырока выкарыстоўваецца пры выкладанні геаграфіі Беларусі ў ВНУ і школах. Падрыхтавана выданне атласа на беларускай мове.

Супрацоўнікамі факультэта напісаны многія дапаможнікі для агульнаадукацыйнай школы, сярод іх: "Геаграфія Беларускай ССР" В.А.Жучкевіча, В.П.Якушка (з 1960 г., 10 выданняў), падручнікі "Геаграфія БССР" В.А.Жучкевіча (з 1970 г., 13 выданняў), "Геаграфія Беларусі" С.І.Сідара (1989, 1995 гг.). У 1993 г. выдадзены вучэбныя дапаможнікі па пачатковаму курсу геаграфіі для 6-га (аўтары І.П.Галай, З.Я.Андрыеўская) і геаграфіі мацерыкоў і акіянаў для 7-га класаў (А.А.Зыль, Г.Я.Рылюк). Гэтымі аўтарамі падрыхтаваны і адпаведныя падручнікі.

Настаўнікам добра вядомы метадычныя працы В.А.Жучкевіча: "Контурныя карты ў курсе геаграфіі васьмігадовай школы" (1963 г.), "Аб метадах выкладання геаграфіі ў школе" (1967 г.), "Геаграфія ў лічбах і параўнаннях" (1971 г.), "Вывучэнне геаграфіі Беларусі ў курсе геаграфіі СССР" (сааўтар Н.С.Юрцэвіч) (1974, 1979 гг.), "Пытанні і заданні па геаграфічнай карце і глобусу" (1972, 1981 гг.), "Нагляднасць у выкладанні геаграфіі" (1975, 1983 гг.), "Даведнік па геаграфіі БССР" (1986 г.). На настаўнікаў геаграфіі разлічаны выданні "Летнія вандроўкі па роднаму краю" В.П.Якушка (1952, 1955 гг.), "Геалогія ў школьнай

геаграфіі” Дз.М.Каруліна (1973 г.), “Ахова прыроды і выкладанне геаграфіі” З.Я.Андрыеўскай (1990 г.).

Для настаўнікаў і вучняў прызначаны: хрэстаматыі па геаграфіі Беларусі (1954, 1962, 1977, 1989, 1991 гг.), першым укладальнікам якіх, пазней і рэдактарам, з'яўляецца В.П.Якушка, а супрацоўнікі факультэта – аўтарамі многіх артыкулаў; “Геаграфічны слоўнік школьніка” І.П.Галая, С.І.Сідара (1986 г.); энцыклапедычны даведнік “Геаграфія Беларусі” (1992 г.), у складзе рэдкалегіі якога Л.В.Казлоўская, С.І.Сідар, В.П.Якушка; “Руска-беларускі фізіка-геаграфічны слоўнік” З.Я.Андрыеўскай, І.П.Галая (1994 г.). Для абітурыентаў выдадзены дапаможнікі па геаграфіі (1978 г., пад рэдакцыяй В.Г.Заўрыева; 1988 г., аўтары І.П.Галай, Я.М.Мяшэчка, С.І.Сідар).

Выкладчыкі і навукоўцы факультэта – аўтары многіх навукова-папулярных выданняў, сярод якіх “Па дарогах В'етнама” В.Г.Заўрыева (1968 г.), “Каляндар прыроды Беларусі” А.Х.Шкляра (1967, 1979 гг.), “Дарогі і водныя шляхі Беларусі” В.А.Жучкевіча (1977 г.), “Край азёрны” В.П.Якушка (1969, 1978 гг.), “Дарогамі дружбы: Беларускае і Украінскае Палессе” І.І.Пірожніка, В.С.Аношкі, С.І.Ката (1985 г.), “За даляглядам Айкумены. Іван Чэрскі” В.А.Ярмоленкі (1995 г.). Вучням сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту адрасаваны кнігі “Чаму так названа” В.А.Жучкевіча (1969 г.), “Жыццё глебы” М.К.Чартко (1976 г.), “Неўміручая песня лясоў” В.Н.Кісялёва (1992 г.), “Пра рэльеф Беларусі” В.А.Мацвеева і В.П.Якушка (1994 г.). Многа карыснага і цікавага знойдуць вучні і настаўнікі ў кніжках серыі “Прырода рэк, азёр і вадасховішч Беларусі”, некаторыя з іх напісаны выкладчыкамі і навукоўцамі факультэта.